Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

# ВЯСЕЛЫЯ ГУЛЬНІ БЕЛАРУСАЎ

Забава ў першай рознаўзроставай группе

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна,
выхавальнік дашкольнай адукацыі
1 кваліфікацыйнай катэгорыі

аг. Грыцкевічы, 2022

Мэта: стварэнне ўмоў для развіцця рухальных якасцяў з дапамогай беларускіх народных гульняў.

Задачы: стварыць умовы для фарміравання ведаў пра беларускія народныя гульні; спрыяць развіццю спрыту, хуткасці рэакцыі, увагі, назіральнасці; садзейнічаць фарміраванню патрыятызму, любові да роднага краю.

Ход мерапрыемства

1. Падрыхтоўчы этап.

Дорбы дзень, дзеці!

Сёння мы з вамі даведаемся пра некаторыя гульні беларускага народа, навучымся гуляць у іх.

2. Палічымся!

Але, перш чым пачаць гуляць, часцей за ўсё патрэбна было палічыцца.

*Бусел, бусел, клякатун,*
*Схапіў жабу за каўтун.*
*Цёгаў, цёгаў, валачыў,*
*Покі дождж не намачыў.*

3. Час гульні.

А цяпер прыйшоў час пагуляць. І першая наша гульня называецца "Што робіш?".

Дзеці выбіраюць гаспадыню і, стаўшы ў круг, малююць вакол сябе кружкі. Гаспадыня абыходзіць ігракоў, задае кожнаму работу, напрыклад пячы хлеб, варыць абед, пілаваць дровы, касіць сена і г.д. Дзеці пастукваюць палачкай па свайму кружку і ўвесь час гавораць, якую работу яны выконваюць. Даўшы кожнаму заданне, гаспадыня становіцца ў сярэдзіне круга і гаворыць:

- *А цяпер будзем усе забіваць цвікі!*

Праз некаторы час яна загадвае ім пілаваць, затым стругаць і г. д. Дзеці абавязаны выконваць усё, што загадвае гаспадыня. Даўшы некалькі заданняў, гаспадыня паказвае прутком на аднаго з ігракоў і нечакана пытаецца: *"Што робіш?"*.

Ігрок павінен адразу ж назваць работу, якую яму даручылі ў пачатку гульні, пасля чаго гаспадыня дае ўсім новыя заданні. Перамагае той, хто ні разу не памыліўся.

Вось мы паслухалі нашу кемлівую гаспадыню, а зараз – новая цікавая гульня. І яе назва – "Прэла-гарэла".

Адварніцеся і стойце з заплюшчанымі вачыма.

Вядучы ў розных месцах хавае прадметы, гаворачы пры гэтым:

*Прэла-гарэла,*
*За мора ляцела,*

*А як прыляцела,*
*Дык недзе і села.*
*Хто першы знойдзе,*
*Той сабе возьме!*

Пасля гэтых слоў усе разбягаюцца па пляцоўцы і шукаюць схаваныя прадметы.

Хто знойдзе больш за усіх, той і выйграў.

Наступная гульня – “Міхасік”. Мы павучымся хутка і спрытна абуваць лапці.

Абручы раскладваюцца па крузе, вакол іх становяцца гульцы. Адзін з гуляючых гаворыць такія словы:

*Ты, Міхаська, не зявай, не зявай!*
*Лапаточкі абувай, абувай!*

Пад беларускаю народнаю мелодыя, гульцы танцуючы рухаюцца па крузе. Як толькі музыка заканчваецца, усе спыняюцца і стараюцца як мага хутчэй “абуць лапці” – заняць свабоднае месца у адным з абручоў. Гулец, які застаўся без “лапцяў”, выбывае з гульні.

Пасля гэтага забіраецца яшчэ адзін абруч, і гульня працягваецца да той пары, пакуль у крузе не застанецца адзін гулец. Ён лічыцца пераможцам.

4. Падвядзенне вынікаў.

Мы гулялі і таксама даведаліся многа новага. Якая гульня спадабалася вам больш? Пра што новае і цікавае вы даведаліся.